3. Мурікан, Ж. Журналістське розслідування / Жак Мурікан ; пір. з фр. – Київ : ІМІ, 2003. – 178 с.
4. Тертычный, А. А. Расследовательская журналистика / А. А. Тертычный. – М. : Аспект Пресс, 2002. –384 с.
5. Шостак, М. И. Репортер: профессионализм и этика / М. И. Шостак.– М. : РИП-холдинг, 2001. – 165 с.

**Уладзімір Субат**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*

# ЗНАЧНАСЦЬ І ВАЖНАСЦЬ ДАКУМЕНТАЛЬНАГА АРСЕНАЛА Ў ЖУРНАЛІСЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Інфармацыйная прастора чалавецтва пастаянна пашыраецца, узбагачаецца новымі формамі і відамі камунікацыі, інтэграцыяй жанраў і метадаў журналісцкай дзейнасці. Цяжка знайсці на планеце куточак, дзе б не было доступу да мноства сайтаў сусветнай павуціны інтэрнэта, інфармацыі тэле - і радыёканалаў, перыядычных выданняў.

Для падрыхтоўкі матэрыялаў патрэбна фактура, нагода. У асноўным на дакументальным матэрыяле грунтуецца аснова публіцыстычных жанраў. У беларускай прэсе за апошнія гады даволі рэдкімі сталі такія жанры публіцыстыкі, як фельетон, нарыс, падарожныя замалёўкі, эсэ і некаторыя іншыя. Большасць выданняў імкнецца зацікавіць чытачоў сенсацыйнымі публікацыямі.

Адно з цэнтральных рэспубліканскіх выданняў – «Сельская газета», выдавец якой – установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Редакция газеты “Советская Белоруссия”». Творчы калектыў галоўнага аграрнага выдання рэспублікі (амаль два дзясяткі творчых супрацоўнікаў) імкнецца абагачаць сваю жанравую палітру. Журналісты пры падрыхтоўцы газетных матэрыялаў, асабліва аналітычных, мемуарных, выкарыстоўваюць дзённікавыя запісы, перапіску, а таксама асабістыя дакументы герояў матэрыялаў. Даволі часта выкарыстоўваюцца і рэтраздымкі, фотакопіі ўнікальных дакументаў.

Шосты год супрацоўнічаю з гэтым перыядычным выданнем, якое набліжаецца да стагадовага юбілею. Серыя нарысаў пра цікавых асоб пад рубрыкай «Вытокі з Уладзімірам Субатам» выходзіла штотыднёна на працягу трох гадоў і завяршылася выданем публіцыстычнага зборніка нарысаў «Вытокі».

Рыхтуючы матэрыялы гэтай рубрыкі пра цікавых людзей зямлі беларускай, пастаянна выкарыстоўваў розныя дакументы і больш за ўсё аўтабіяграфічныя звесткі пра герояў. Пры гэтым нельга не забываць, што

значная розніца паміж аўтабіяграфіяй, падрыхтаванай для публікацыі, і таго яе варыянта, што разлічаны на вузкае кола людзей. У газетных матэрыялах увага акцэнтуецца на больш цікавыя факты, падзеі з жыцця чалавека, найбольш важныя гістарычныя моманты.

Другі год запар штосуботы чытачы маюць магчымасць знаёміцца з «Вандроўкамі з Уладзімірам Субатам», кожная з якіх прысвячаецца аднаму з беларускіх мястэчак. Ракаў, Друя, Рудзенск, Івянец, Рубяжэвічы, Любча, Мір, Леніна, Васілевічы, Тураў, Давыд-Гарадок, Бягомль, Плешчаніцы, Лагішын, Косава, Ружаны… Амаль сотня старажытных паселішчаў з розных куткоў Беларусі прадстаўлена ў гэтым цыкле. Сярод творчага арсенала для падрыхтоўкі такіх вандровак – дзённікі, прыватныя запісы, лісты, тэксты размоў і іншыя крыніцы інфармацыі. Асабліва дапамагаюць перадаць гісторыю гэтых мясцін архіўныя дакументы. У іх адлюстроўваюцца цікавыя і важныя гістарычныя факты, падзеі, дакладна згадваюцца асобы.

Варта адзначыць, што пры падрыхтоўцы такіх нарысаў, калі гаворка заходзіць пра лёсы людзей, іх асабістае жыццё, варта не забываць пра этычныя абмежаванні на доступ да крыніц. І ў першую чаргу права на ахову асабістага жыцця, у тым ліку тайна перапіскі, тэлефонных размоў, дзённікаў, запісак і іншых асабістых дакументаў.

З мноства падзей, фактаў, якія становяцца вядомымі журналісту, ён павінен агалошваць толькі тыя, што, на яго думку, павінны прыцягнуць грамадскую ўвагу. Пры гэтым не трэба забываць пра розніцу паміж грамадскім інтарэсам і абывацельскай цікавасцю. Але бывае і такое, што публікацыя асабістых дакументаў становіцца адзіным спосабам аднавіць справядлівасць. У такім выпадку даводзіцца меркаваць, што больш прынясе публікацыя: карысці ці шкоды. Згадваецца выпадак з працы на Беларускім тэлебачанні, калі з творчай групай рыхтаваў тэленарыс пра народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. Здымалі на яго радзіме ў палескай вёсцы Глінішча. Запісвалі інтэрв’ю з землякамі, здымалі ў мемарыяльным музеі народнага пісьменніка. Экскурсавод расказала пра цікавую гісторыю фотаздымка жанчыны, якою захапляўся ў маладыя гады Іван Мележ. Жыццёвыя шляхі іх потым разышліся. Іван Паўлавіч займеў сваю сям’ю. Пасля выхаду праграмы ў эфір у рэдакцыю звярнуліся са скаргаю сваякі пісьменніка. Ім не спадабалася, што ў матэрыяле згадалі пра асабістае жыццё Івана Мележа. Давялося шукаць выхад з сітуацыі.

Безумоўна, неабходна правяраць дакладнасць фактаў і ўзважваць, ці варта іх абнародаваць. Выкарыстоўваючы лісты, дзённікавыя запісы,

успаміны людзей, трэба адчуваць меру дазволенага, быць карэктным і ўзважваць кожнае слова. Але ў першую чаргу не парушаць дзяржаўныя законы.

**Валерий Толкачёв**
*Белорусский государственный университет (г. Минск, Беларусь)*

## РОЛЬ МОТИВАЦИИ В ПРОЦЕССЕ ФОРМИРОВАНИЯ ГРАЖДАНСКОЙ ПОЗИЦИИ ЖУРНАЛИСТА

Гражданская позиция журналиста – это сложное, многообразное, многопрофильное явление. Именно в процессе ее понимания, осмысления и первичного накопления знаний формируются такие важные качества современного журналиста, как рационалистическое, научное мировоззрение, критическое мышление, гибкий ум, ясность мысли, способность объективно, взвешенно разбираться в явлениях жизни [1; 3]. Эти факторы оказывают существенное влияние на становление его как настоящего профессионала, высокоразвитой личности, объективно разбирающейся в проблемах современности [5]. В процессе изучения спецкурса «Гражданская позиция журналиста» у студентов вырабатываются профессионально-нравственные представления, определяющие основу активной гражданской позиции и выступающие доминантой в профессиональном развитии, отражаясь в таких критериях, как «профессиональный долг», «профессиональная ответственность», «профессиональная честь», «профессиональное достоинство», «профессиональное поведение».

Основными условиями формирования личности журналиста, а следовательно, и его активной гражданской позиции выступают мотивация и интеллект, важным является обучение студентов умению делать умозаключения, обобщать, сопоставлять, систематизировать, оценивать различные методы, события, факты, явления, а также правильно определять уровни информации и степень ее воздействия. Именно мотивация, соединяя внутренние и внешние факторы, побуждает студента к активной учебной и внеучебной деятельности, придает ей определенную осмысленность, нацеливает на получение современных, качественных знаний, необходимых для дальнейшей профессиональной деятельности [2; 4].

Формирование мотивационной сферы студента в процессе изучения спецкурса «Гражданская позиция журналиста» состоит из следующих стадий: направленность (внутренняя целевая установка), самооценка (готовность к выполнению намеченного), самоубеждение (стремление